# ГУЛЬНЯ ПА ПРАВІЛАХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Выступаючы на пасяджэнні, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «За мінулыя тры з паловай гады з дня ўступлення ў сілу дагавора (аб Еўразійскім эканамічным саюзе. — **Заўвага БелТА**) праведзена вялікая работа па пытаннях міждзяржаўнага ўзаемадзеяння. Аднак эфектыўнасць праводзімых мерапрыемстваў усё яшчэ вымушае жадаць лепшага». Паводле слоў Прэзідэнта, многія дамоўленасці застаюцца па-ранейшаму нерэалізаванымі. «Першапачаткова саюз стварыўся як структура для выключна эканамічнага супрацоўніцтва. Меркавалася выбудаваць сістэму раўнапраўных рынкавых адносін. Але ў гандаль рэгулярна ўмешваецца палітыка. Інтарэсы асобных таваравытворцаў перыядычна ставяцца вышэй за прынятыя намі рашэнні. Гэта ідзе насуперак нашым дамоўленасцям», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. «Адзіны станоўчы момант — гэта тое, што мы, нарэшце, разам задумаліся над стварэннем перспектыўных механізмаў не толькі ўрэгулявання спрэчак, але і іх прадухілення», — сказаў беларускі лідар.

Што датычыцца вырашэння спрэчак, якія ўзнікаюць паміж краінамі, Аляксандр Лукашэнка заклікаў не абменьвацца ўзаемнымі прэтэнзіямі праз СМІ, а цывілізавана вырашаць праблемы. «Сёння менавіта рэгіянальныя інтэграцыйныя аб'яднанні ствараюць перадумовы для росту сусветнай эканомікі. А мы, замест таго каб свабодна гандляваць, закрываемся адзін ад аднаго. Больш за тое — абменьваемся ўзаемнымі прэтэнзіямі нават у сродках масавай інфармацыі, рызыкуючы міжнародным аўтарытэтам саюза. Мы ігнаруем цывілізаваны спосаб вырашэння гандлёвых спрэчак праз Еўразійскую эканамічную камісію, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я абсалютна падтрымліваю тых, хто сёння гаворыць, што трэба, канкрэтызаваўшы ролю камісіі з улікам нашага вопыту, узмацніць функцыі агульнага эканамічнага ўрада».

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што структура эканомік краін ЕАЭС шмат у чым розная. Хтосьці больш экспартуе сыравіну, хтосьці больш прадае прадукты перапрацоўкі. «І сыравінная, і вытворчая база ў саюза каласальная. Але мы так і не навучыліся эфектыўна яе выкарыстоўваць, не выпрацавалі адзіных правіл для агульнага рынку», — канстатаваў Прэзідэнт.

Ён звярнуў увагу, што зноў не гатовыя для абмеркавання на вышэйшым узроўні праграмы фарміравання агульных рынкаў газу, нафты і нафтапрадуктаў. «Спадзяёмся, што хоць бы да канца бягучага года мы паставім подпісы пад гэтымі асноватворнымі дакументамі. І не трэба тут падазраваць Беларусь, што гэта толькі ў яе інтарэсах. Мы дамаўляліся, што вырашым гэтае пытанне. Значыць, яго трэба вырашаць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Гаворачы аб станоўчым баку сумеснай працы краін у ЕАЭС, беларускі лідар адзначыў распрацаваны праект палажэння аб статусе дзяржавы-назіральніка. «Але нельга рабіць неабдуманых крокаў, асабліва калі краіны не гатовыя да ўсталявання больш цесных кантактаў з нашай арганізацыяй. ЕАЭС павінен сам даказаць сваю прыцягальнасць для трэціх дзяржаў», — лічыць Аляксандр Лукашэнка. Гаворачы аб дагаворна-прававой базе ЕАЭС, якая пастаянна ўдасканальваецца, беларускі лідар зазначыў, што важна, каб гэтыя дакументы не сталі сухімі інструкцыямі. Што датычыцца створаных спецыяльных галіновых органаў саюза, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што трэба зрабіць усё, каб іх дзейнасць была арыентавана на рашэнне канкрэтных праблем і яны змаглі ўнесці важкі ўклад у стварэнне агульнага рынку без выключэнняў і абмежаванняў.

Прэзідэнт адзначыў, што Беларусь падтрымлівае прынятую лічбавую павестку Еўразійскага эканамічнага саюза да 2025 года. «Мы гатовы ўдзельнічаць у ініцыятывах у сферы лічбавага гандлю, электроннай лагістыкі і лічбавых транспартных калідораў. Неабходна стварыць сумесныя тэхнічныя і прававыя ўмовы, якія дазваляюць аб'ядноўваць нашы нацыянальныя сістэмы ў інтэграцыйныя лічбавыя платформы», — сказаў ён.

«Наш інтэграцыйны праект будзе развівацца толькі пры захаванні чатырох асноўных свабод, якія замацаваны ў Дагаворы аб Еўразійскім эканамічным саюзе. Вельмі важна цаніць і выконваць дасягнутыя дамоўленасці, вырашаць самыя складаныя праблемы, абапіраючыся на намі ж створаныя правілы, паважаць адзін аднаго, як гэта прынята ў саюзнікаў і дзелавых партнёраў. Беларусь настроена менавіта на такі стыль далейшых адносін», — заявіў Прэзідэнт.

* * *

У Сочы Аляксандр Лукашэнка правёў таксама двухбаковыя сустрэчы з лідарамі краін ЕАЭС і прэзідэнтам Малдовы.

У прыватнасці, на сустрэчы з кіраўніком Расіі Уладзімірам Пуціным было абмеркавана развіццё міждзяржаўных адносін. «У нас запланаваны Вышэйшы дзяржсавет. Мы з вамі яшчэ да выбараў (Прэзідэнта Расіі) вызначыліся, што ў Мінску яго правядзём, а затым у нас восенню Форум рэгіёнаў у Магілёве. Звычайна мы ладзілі гэты форум на найвышэйшым узроўні. Я думаю, знойдзеце час, восенню пабудуеце графік, каб наведаць Магілёў. Для вас гэта новы горад. Беларусы і расіяне годна рыхтуюцца, каб правесці форум на высокім узроўні», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі выказаў гатоўнасць падрабязна абмеркаваць назапашаныя пытанні ў двухбаковых адносінах. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што, калі сёння не атрымаецца прыняць нейкія рашэнні, да іх можна будзе вярнуцца ў час будучых мерапрыемстваў.

У сваю чаргу Уладзімір Пуцін канстатаваў, што супрацоўніцтва паміж краінамі працягвае ўмацоўвацца, у тым ліку ў фармаце Еўразійскага эканамічнага саюза.

У адносінах Беларусі і Арменіі няма і не будзе праблем. Аб гэтым Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Арменіі Ніколам Пашынянам. Прэзідэнт выказаў гатоўнасць падрабязна расказаць новаму прэм'еру Арменіі аб развіцці адносін паміж дзвюма краінамі, дзейнасці Еўразійскага эканамічнага саюза. «Вельмі важна, каб вы ад мяне пачулі тое, што датычыцца Беларусі і нашага стаўлення да брацкага армянскага народа і вашай дзяржавы. Таму гэта вельмі важная сустрэча, — заявіў беларускі лідар. — Наогул, вы малайцы. Вы вельмі дастойна і правільна выйшлі з гэтай сітуацыі, вы гэта самі ўжо адчулі. Мы рады за вас». Ён яшчэ раз павіншаваў Нікола Пашыняна з выбраннем прэм'ер-міністрам Арменіі і пажадаў поспехаў на гэтай пасадзе. «На нас вы можаце разлічваць, як і раней. Наша палітыка ў адносінах да вельмі блізкага нам армянскага народа ніколі не зменіцца. Гэта я вам абяцаю. Яна будзе такой жа канструктыўнай, дружалюбнай», — запэўніў Прэзідэнт.

На сустрэчы беларускага лідара з Прэзідэнтам Малдовы Ігарам Дадонам было адзначана, што нашы краіны разлічваюць захаваць дынаміку росту тавараабароту. Ігар Дадон падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за афіцыйны візіт у Малдову. Ён расказаў, што трактары, якія былі падораны беларускім бокам, дастаўлены ў маючыя патрэбу рэгіёны, а сумесна пасаджаная прэзідэнтамі кукуруза ўжо ўзышла.

**Паводле БелТА.**

# У ФАРМАЦЕ ЛІЧБАВАЙ ТРАНСФАРМАЦЫІ

## У Мінску стартаваў 25-ы міжнародны форум «Tibo 2018»

Больш за сотню ІТ-кампаній з 15 краін свету сабраліся ў Мінску: у сталіцы стартаваў 25-ы міжнародны форум «Tibo 2018». Як адзначыў падчас цырымоніі адкрыцця **міністр сувязі і інфарматызацыі Сяргей ПАПКОЎ**, ужо чвэрць стагоддзя форум служыць найважнейшай пляцоўкай для абмеркавання стратэгіі ІТ-развіцця нашай краіны і фарміравання палітыкі па ўкараненні інавацый.

Паводле яго слоў, форум сёлета мае дзве істотныя асаблівасці: ён юбілейны і праводзіцца ў перыяд, калі Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка абвясціў нацыянальным прыярытэтам выкананне задач па стварэнні ІТ-краіны і фарміраванні лічбавай эканомікі. Гэта азначае ўкараненне і паўсюднае выкарыстанне высокіх тэхналогій у жыцці дзяржавы і грамадства.

На думку міністра, форум дазволіць намеціць план дзеянняў па комплекснай трансфармацыі краіны. Сарыентавацца дапамогуць прадстаўленыя на выставе дасягненні, якія ёсць сёння ў Беларусі, і тое новае, што толькі плануецца ўкараняць у эканоміку ў будучыні.

«Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка вызначыў курс развіцця на пабудову ІТ-краіны, інфармацыйнага развіцця, укаранення і прымяненне нана- і біятэхналогій. Гэтая сур'ёзная задача і форум на працягу тыдня дапаможа ўсім нам лепш зразумець з падтрымкай міжнародных экспертаў і апошніх дасягненняў, якія будуць прадстаўлены на выставе, як нам рухацца далей», — растлумачыў міністр.

Сяргей Папкоў таксама адзначыў, што ў краіне ўжо даволі высока развіта інфармацыйна-камунікацыйная інфраструктура. Актыўна вядзецца работа па ўкараненні як сотавай, так і фіксаванай сувязі. У перспектыве далейшае развіццё атрымаюць тэхналогіі індустрыяльнага інтэрнэту, інтэрнэту рэчаў, воблачных тэхналогій, вялікіх даных, размеркаваных сістэм транзакцый.

XXV міжнародны форум «Tibo 2018» праходзіць у Мінску з 14 да 18 мая. Сярод удзельнікаў будуць аператары «Белтэлекам», МТС, velcom, beCloud, «Космас ТБ», МТІС, Белпошта. Цэнтральнай экспазіцыяй на выставе будзе стэнд «ІТ-краіна Беларусь». Тут будуць прадстаўлены інавацыйныя распрацоўкі ў сферы інфармацыйных тэхналогій дзяржорганаў і беларускіх ІТ-кампаній, рэзідэнтаў Парка высокіх тэхналогій.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

■ Напярэдадні

# Пляцоўка для шчырай дыскусіі

**З 23 да 25 мая ў Мінску пройдзе маштабны форум «Усходняя Еўропа: пытанні бяспекі для ўсіх» на пляцоўцы ініцыятывы «Мінскі дыялог». На ім эксперты абмяркуюць пытанні бяспекі. У форуме возьмуць удзел прадстаўнікі беларускай улады, прычым на самым высокім узроўні, генсек АБСЕ Томас Грэмінгер, генсек АДКБ (2003—2017) Мікалай Бардзюжа, намеснік памочніка генсека НАТА па палітычных пытаннях і палітыцы бяспекі Джэймс Апатурай, старшыня ПА АБСЕ (2016—2017) Крысцін Мутанен. Таксама чакаюць шырокае прадстаўніцтва замежных фондаў і цэнтраў, экспертнай супольнасці і бізнесу. Увогуле — каля 350 удзельнікаў.**

Арганізатары форуму расказалі, што будзе адбывацца падчас трох насычаных дзён. **Яўген ПРЭЙГЕРМАН, кіраўнік экспертнай ініцыятывы «Мінскі дыялог»**, нагадаў, што як дыскусійная пляцоўка гэта ініцыятыва працуе ўжо тры гады: дае слова экспертам па актуальных пытаннях і больш удзяляе ўвагі невялікім дзяржавам. За гэты час праведзена 11 міжнародных канферэнцый, а таксама шэраг даследчых мерапрыемстваў. У выніку работы сфарміраваўся фундамент для правядзення сёлетняга буйнога форуму.

Яўген Прэйгерман адзначыў, што зараз няма такіх пляцовак, дзе праходзіць шчырая дыскусія, не ператвараючыся ў частку інфармацыйнай вайны. І гэта, на яго погляд, вялікая праблема, якая і стала адной з нагод для правядзення форуму. На дыскусійных пляцоўках у Мінску будзе прадстаўлена больш за 40 краін.

**Каардынатар праграмы «Знешняя палітыка Беларусі» экспертнай ініцыятывы «Мінскі дыялог» Дзяніс МЕЛЬЯНЦОЎ** расказаў, што падчас работы секцый рэгіянальныя выклікі і канфлікты будуць разглядацца праз прызму глабальных тэндэнцый. Тэмы закрануць як аб'ёмныя пытанні, напрыклад трансфармацыю сусветнага парадку і праблемы міжнародных рэжымаў бяспекі, так і канкрэтныя выпадкі: санкцыйную вайну Захаду і Расіі, імплементацыю мінскіх пагадненняў і іншыя. Таксама чакаецца работа асобнай секцыі па Эканамічным поясе Шаўковага шляху.

**Надзея АНІСОВІЧ**

■

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## РАЎХАНІ ПАЦВЕРДЗІЎ: ЯДЗЕРНАЯ ЗДЗЕЛКА Ў СІЛЕ «НАСУПЕРАК ВОЛІ ЗША»




Прэзідэнт Ірана Хасан Раўхані зноў пацвердзіў, што яго краіна будзе прытрымлівацца ўмоў ядзернай здзелкі «насуперак волі ЗША». Заяву прэзідэнта Дональда Трампа аб выхадзе з шасцібаковага пагаднення ён назваў «злачынствам супраць маралі», перадае Reuters.

Раўхані пракаментаваў будучыню ядзернага пагаднення на сустрэчы з прэзідэнтам Шры-Ланкі. «Калі тыя пяць краін, што засталіся, будуць прытрымлівацца ўмоў пагаднення, Іран таксама будзе прытрымлівацца здзелкі, нягледзячы на пазіцыю ЗША», — цытуе прэзідэнта Ірана Reuters.

Нагадаем, акрамя ЗША, усёабдымнае пагадненне з Іранам заключылі таксама Расія, Вялікабрытанія, Францыя, Германія і Кітай.

Аб выхадзе з пагаднення прэзідэнт ЗША Дональд Трамп абвясціў 8 мая. Разам з пагадненнем адмяняецца і рэжым зняцця з Ірана санкцый, якія закраналі экспарт нафты і пастаўкі туды пэўных тавараў.

Раней Хасан Раўхані ўжо заяўляў, што здзелка можа застацца ў сіле, «калі мы дасягнем мэт, прапісаных у пагадненні».

Ядзерная здзелка была ўзгодненая Тэгеранам і шасцю сусветнымі дзяржавамі ў 2015 годзе. У студзені 2016 года пагадненне ўступіла ў стадыю рэалізацыі. Дамоўленасць прадугледжвае адмену санкцый, уведзеных у дачыненні да Ірана Саветам Бяспекі ААН, ЗША і Еўрасаюзам. Узамен Тэгеран абавязаўся абмежаваць сваю ядзерную дзейнасць, паставіўшы яе пад міжнародны кантроль.

## ПРЭМ'ЕР-МІНІСТР ІЗРАІЛЯ ЗАКЛІКАЎ УСЕ КРАІНЫ ПЕРАНЕСЦІ ПАСОЛЬСТВА Ў ІЕРУСАЛІМ

Біньямін Нетаньяху заклікаў усе краіны па прыкладзе ЗША перанесці свае пасольствы ў Іерусалім, паведамляе РІА «Навіны». На думку палітыка, гэта дапаможа дасягненню міру ў рэгіёне.

Такую заяву прэм'ер-міністр зрабіў на ўрачыстым прыёме ў гонар адкрыцця ў Іерусаліме амбасады ЗША. «Вы не можаце пабудаваць свет на падмурку хлусні. Вы будуеце мір на падмурку праўды, а праўда не толькі ў тым, што Іерусалім на працягу тысячагоддзяў быў сталіцай яўрэйскага народа, сталіцай нашай дзяржавы з моманту заснавання, праўда яшчэ і ў тым, што ў рамках любога мірнага пагаднення, якое толькі можна ўявіць, Іерусалім застанецца сталіцай Ізраіля», — сказаў ізраільскі прэм'ер.

Узяць прыклад з ЗША ўжо пагадзіліся Гватэмала і Парагвай. Іншыя краіны, у тым ліку і Беларусь, пакуль пакідаюць свае дыппрадстаўніцтвы ў Тэль-Авіве.

Статус Іерусаліма доўгі час застаецца спрэчным. На ўсходнія раёны і гістарычны цэнтр горада прэтэндуюць палесцінцы.

Напярэдадні адкрыцця амерыканскай амбасады ў Іерусаліме ў горадзе асцерагаюцца масавых беспарадкаў. Тут узмоцнены меры бяспекі: у рэгіён накіраваны тысячы салдат арміі абароны Ізраіля.